га статусу мастацкага вобраза дазваляе ўключыць тэксты П.А.Фларэнскага (маюцца на ўвазе перш за ўсё «Обратная перспектива» і «Иконостас») у курс культуралогіі ў якасці класічнага прыкладу аналізу асаблівасцей мастацкай творчасці.

**Смялянская І.І.**, *дацэнт*

## НОВЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫКЛАДАННЯ ФІЛАСОФІІ АСПІРАНТАМ І СУІСКАЛЬНІКАМ

Пошук новых падыходаў да выкладання філасофіі ў ВНУ, у тым ліку аспірантам і суіскальнікам, абумоўлены шэрагам працэсаў сацыяльна-палітычнага, эканамічнага, духоўнага характару, якія адбываюцца ў апошнія гады ў нашым грамадстве. Ёсць даволі рэальная небяспека ідэйна-светапогляднага і каштоўнаснага вакууму ў адносінах да філасофіі. Гэтаму спрыяе характэрная асаблівасць сучаснага цывілізацыйнага развіцця — распад і дыскрэдытацыя розных форм традыцыйнай аўтарытарнай культуры, адмаўленне шырокімі пластамі грамадства (і ў першую чаргу моладдзю) таго, што завецца «рэпрэсіўнай культурай».

Ва ўмовах традыцыйнай аўтарытарна-рэпрэсіўнай культуры моладзь не мела права на свае меркаванні, ёй адназначна адводзілася роля рэцыпіента тых норм і ўстановак, якія задае ёй старэйшае пакаленне. Сучасная моладзь не прызнае аўтаматызму і адмаўляецца ад такога размеркавання роляў. Патрэбна адзначыць, што сітуацыя, якая склалася ў нашым грамадстве ва ўмовах пераходнага перыяду, з усімі яго крызіснымі з'явамі ў духоўнай сферы, параджае небяспечныя і дэструктыўныя эфекты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вядома, што на пераломных этапах гісторыі сацыяльна-палітычным змяненням папярэднічалі карэнныя эмены ў філасофскім асэнсаванні рэчаіснасці. Так было ў Францыі XVIIIст., Германіі XIXст., Расіі пачатку XXст.

Што датычыцца канца XX стагоддзя, то змены, якія адбываюцца ва ўсіх сферах жыцця, засталі філасофію у разгубленым стане. Марксісцка-ленінская філасофія, якая ўсталявалася за гады савецкай улады і прэтэндавала на ісціну ў апошняй інстанцыі, фарміравала фетышысцкія формы масавай свядомасці, абсалютызавала аўтарытарную свядомасць і ў такім выглядзе выконвала сваю ролю ў жыцці грамадства.

Праблемы, якія ставіліся і разглядаліся з іншых пазіцый, аб'яўляліся як варожыя марксізму і падвяргаліся жорсткай крытыцы. Той факт, што да філасофіі марксізму неабходна падыходзіць як да з'явы гістарычнай, якая сама развіваецца адпаведна развіццю рэчаіснасці, перастаў улічвацца. Але нельга быць толькі праціўнікам каго-небудзь ці чаго-небудзь. Абараняць сваю пазіцыю трэба зыходзячы не з адмаўлення, а са сцвярджэння; проста апазіцыйнасць не можа быць падмуркам развіцця, яна дыктуецца праціўнікам, вызначаецца як антыкаштоўнасць.

На жаль, пазіцыя і саміх крытыкаў выяўляе адсутнасць цвёрдых асноў, і сёння мы калі не з жахам, то з расчараваннем бачым, як з развалам таталітарнай сістэмы, разбурэннем знешніх і ўнутраных перагародак для «свабоднага волевыяўлення» ўсе каштоўнасці і ідэалы ці аказаліся пад сумненнем, ці сталі крыніцай яшчэ больш фанатычных і дагматычна-ідэалагічных плыняў.

Філасофія як вучэнне аб найвялікшых пытаннях, здольных хваляваць чалавека (пытаннях аб сэнсе жыцця, аб асобе і яе спадзяваннях), у канцы XX стагоддзя замест таго, каб прадугадаць жыццё, апынулася ў хвасце падзей.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Каб выйсці з гэтага цяжкага становішча, філосафам трэба дакладна вызначыць, якімі праблемамі філасофія павінна займацца. Перш за ўсё, яна павінна адмовіцца ад схаластыкі і заняцца праблемамі сэнсу жыцця, жыццёвай мудрасці ў самым шырокім і глыбокім сэнсе гэтага слова. Але вяртаючыся да жыццёвай мудрасці, патрэбна пазбягаць небяспекі новага рабства, падпарадкавання вузкаму жыццёваму практыцызму. Трэба імкнуцца пазбягаць памылак, што мелі месца ў пасляарыстоцелеўскай філасофіі (якая звузіла філасофію да этыкі) і ў нашай недалёкай мінуўшчыне (калі філасофію звялі да ідэалогіі). Філасофія павінна пазбягаць крайнасцей, таму ёй асабліва важна не ісці беспераньінна па шляху рэзкага адасаблення тэарэтычных функцый ад практычных (што намячалася яшчэ ў антычнасці і ў некаторых выпадках прывяло да чыстай тэорыі). У прынцыпе «веды дзеля ведаў» глыбокая праўда жыве толькі да таго моманту, пакуль мы глядзім на гэты прынцып як на эўрыстычны. Філасофскія веды не могуць не быць дзейснымі; яны павінны ствараца дзеля праўды, праўды шырокай, ісціннай, справядлівай і праўды — жывой паўнаты сэнсу. Сапраўды меў рацыю Фіхтэ, які пераконваў свайго чытача моцна трымацца жыцця ў філасофіі.

Вышэйазначаныя праблемы паставілі сёння выкладчыкаў перад неабходнасцю шукаць новыя падыходы пры выкладанні філасофіі ў ВНУ у цэлым, і аспірантам і суіскальнікам у прыватнасці.

Пачынаць перш за ўсё трэба з фарміравання пазітыўнай стратэгіі філасофіі, здольнай супрацьстаяць разбуральным працэсам у грамадстве. У той жа час нельга дапускаюць вяртання на пазіцыі аўтарытарызму і дыктату ў адносінах да асобы. Філасофія павінна спрыяць фарміраванню свабоднага і адказнага чалавека, здольнага канструктыўна працаваць у праблемных сітуацыях, які спалучае прафесійную кампетэнтнасць з грамадзянскай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адказнасцю, з адпаведным светапоглядным кругаглядам і маральнай свядомасцю. Менавіта «дэфіцыт» такой асобы з'яўляецца першапрычынай нашых сучасных цяжкасцей і бед.

Пошукі новых падыходаў да выкладання філасофіі накіраваны на паэтапнае, частковае вырашэнне існуючых праблем.

Перш за ўсё работу з аспірантамі і суіскальнікамі неабходна арганізаваць такім чынам, каб яны адчулі патрэбу ў філасофіі і цікавасць да яе. Не парушаючы стэрэатыпаў арганізацыі вучэбнага працэсу (лекцыі, семінары, пісьмовая работа, іспыты і інш.), трэба напаўняць іх новым зместам.

Лекцыйны курс варта прысвяціць актуальным праблемам, якія сёння стаяць перад чалавецтвам. Многія з іх былі пастаўлены яшчэ ў старажытныя часы, і на гэта трэба звяртаць увагу аспірантаў і суіскальнікаў. Пра падыходы да вырашэння гэтых праблем у сціслым выглядзе можна расказаць у лекцыі ці прапанаваць звярнуцца да першакрыніц і самастойна разабрацца ў іх значнасці.

На лекцыі неабходна пазбягаць догмаў, не навязваць свайго бачання той ці іншай праблемы.

Планы правядзення семінарскіх заняткаў складаюцца з улікам таго, што ўсе слухачы прайшлі поўны курс навучання філасофіі ў аб'ёме праграмы ВНУ.

Філасофскі семінар — адна з вядучых форм вучэбна-практычных заняткаў, калі на аснове папярэдняй работы над праграмным матэрыялам у працэсе непасрэдных зносін кіраўніка і ўдзельнікаў семінара, у ходзе ўзнікаючых дыскусій вырашаюцца задачы фарміравання навыкаў філасофскага аналізу тэарэтычных праблем, засвойваюцца метады і прынцыпы навуковай работы.

Асноўныя задачы і прынцыпы работы філасофскага семінара зводзяцца да наступнага:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— па-першае, семінар прызваны забяспечыць засваенне класічнага філасофскага матэрыялу;

— па-другое, семінар павінен садзейнічаць фарміраванню навыкаў самастойнай работы з літаратурнымі крыніцамі рознага тыпу, дапамагчы авалодаць метадамі крытычнага аналізу. Аспіранты і суіскальнікі павінны навучыцца падбіраць літаратуру па вывучаемаму пытанню, працаваць з бібліятэчнымі каталогамі і даведачнымі выданнямі, правільна складаць і афармляць бібліяграфічныя спісы;

— па-трэцяе, на семінары неабходна развіваць навыкі падрыхтоўкі пісьмовага даклада, рэферата, анатацыі, рэцэнзіі; навучыцца пісьменна афармляць спасылкі на крыніцы. Семінар павінен праводзіцца ў выглядзе дыскусій, абмеркаванняў, дзе веды кожнага выступаючага выносяцца на суд сяброў і кіраўніка семінара. Таму семінар дапамагае слухачам навучыцца выступаць перад аўдыторыяй, уважліва слухаць выступленні іншых удзельнікаў, выдзяляць іх моцныя і слабыя бакі, аргументаваць свае заўвагі — адным словам, навучыцца весці дыскусію.

Семінарскія заняткі адкрываюць шырокія магчымасці свабоднага абмеркавання найбольш важных праблем, якія закраналіся ў лекцыйным курсе, дазваляюць прааналізаваць важнейшыя грамадска-палітычныя праблемы, памагаюць аспірантам і суіскальнікам пацвердзіць ці перагледзець свае погляды на тыя або іншыя праблемы.

Кожным аспірантам павінна быць выканана пісьмовая вучэбна-навуковая работа па філасофіі. Падрыхтоўка рэферата — адна з найбольш складаных форм самастойнай работы аспіранта і суіскальніка. Рэферат павінен быць арыентаваны на філасофска-метадалагічную праблематыку той галіны ведаў, у якой аспірант спецыялізуецца. Работа над рэфератам па філасофіі — гэта своеасаблівае логіка-метадалагічнае асэнсаванне дысертацыйнага даследавання суіскальніка. Галоўная задача — не гістарычная рэтраспекцыя дысертацыйнай

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

праблематыкі ці папулярны пераказ якіх-небудзь спецыяльных навуковых пытанняў, а філасофскі, светапоглядны, логіка-метадалагічны аналіз сфармуляванай аўтарам праблемы. У рэфераце павінны быць адлюстраваны філасофска-метадалагічныя пазіцыі суіскальніка, яго адносіны да аналізуемых літаратурных крыніц і аргументаваныя ўласныя вынікі.

Кіраўнік семінара найбольш падрыхтаваным суіскальнікам можа прапанаваць замест рэферата напісаць рэцэнзію, напрыклад, на артыкул ці манаграфічнае выданне.

У рэцэнзіі неабходна:

— адлюстраваць актуальнасць праблемы, вырашэнню якой прысвечана рэцэнзуемая работа;

— даць пазітыўны пераказ разглядаемых пытанняў з выдзяленнем галоўнай ідэі і вызначэннем таго, наколькі эмпірычны матэрыял, які выкарыстоўвае аўтар, садзейнічае раскрыццю пастаўленай праблемы;

— вылучыць дыскусійныя пытанні і ацаніць прапанаваныя аўтарам рашэнні;

— вызначыць навізну і важнасць дадзенай публікацыі для развіцця навукі і практыкі.

Завершыць увесь цыкл работы экзамен, на якім камісія павінна будзе вызначыць якасць засваення суіскальнікамі філасофскіх ведаў.

Такім чынам, арганізаваная работа з аспірантамі і суіскальнікамі (пры іх сур`ёзных адносінах да вучобы) будзе станоўчым падмуркам для своечасовага напісання і абароны дысертацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ